# Пісьменніку натхнення і пачуцця

22 ліпеня ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прайшло адкрыццё выставы «Ян Баршчэўскі, які любіў Бога, прыроду і людзей». На ёй цягам усяго аднаго тыдня ўпершыню былі прадстаўленыя разам аўтэнтычныя сведчанні пра знакамітага пісьменніка, аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры.

Упершыню ў Мінску можна было пабачыць нядаўна адшуканую пахавальную пліту пісьменніка, што стала сапраўднай сенсацыяй у айчынным літаратуразнаўстве і дазволіла адкрыць малавядомыя старонкі яго біяграфіі. Разам з ёй на выставе выстаўлялі найбольш каштоўныя артэфакты з фондаў НББ – аўтэнтычныя прыжыццёвыя выданні Я. Баршчэўскага: зборнік «Шляхціч Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (1844 – 1846), альманах «Незабудка» (1840 – 1844) і іншыя вельмі каштоўныя выданні. Нягледзячы на вялікую цікавасць у нашай краіне да асобы і творчасці пісьменніка, яны да сёння застаюцца недастаткова вывучанымі з-за нешматлікасці дакладных крыніцаў. Калі ж некалькі гадоў таму ў горадзе Чуднаў (Жытомірская вобласць, Украіна) было адшуканае надмагілле Я. Баршчэўскага, то гэта выклікала сапраўдны выбух цікавасці як з боку даследчыкаў, так і ўсіх зацікаўленых нашай мінуўшчынай. На надмагіллі можна прачытаць эпітафію: «Ян Баршчэўскі, які любіў Бога, прыроду і людзей. Пісьменнік натхнення і пачуцця. Жыў годна 70 гадоў. Памёр 28 лютага 1851 года».



*Фронціспіс першага выдання «Шляхціча Завальні»*

Сёлета пры падтрымцы Фонду імя Марыі Магдалены Радзівіл і Расонскага раённага выканаўчага камітэта надмагільная пліта вагою ў 35 кілаграмаў была дастаўленая ў Беларусь і экспанавалася ў музеях роднай для пісьменніка Віцебшчыны: у Расонах, Полацку і Віцебску, а цяпер ненадоўга трапіла ў Мінск, у Музей кнігі.

Пасля своеасаблівага падарожжа каштоўная пліта вернецца на месца свайго паходжання, а рэдкія выданні трапяць назад у фондасховішча Нацыянальнай бібліятэкі.

*Паводле інфармацыі НББ*